# Аналіз працы Камітэта абароны рэпрэсаваных “Салідарнасьць” за 2006-2008 гады

***Аналіз дзейнасці Камітэта абароны рэпрэсаваных "Салідарнасьць" за 2006-2008 гады***

Гэты дакумент з'яўляецца аналітычным даследаваннем, якое правёў Камітэт абароны рэпрэсаваных "Салідарнасьць" за перыяд з красавіка 2006 года па красавік 2009 года. Аналітычны матэрыял дазваляе зрабіць высновы адносна формаў рэпрэсій рэжыма супраць актыўных грамадзянаў, прыналежнасці рэпрэсаваных грамадзянаў да партый і грамадскіх арганізацый, вызначыць узрост, ступень адукацыі, полавую прыналежнасць, а таксама прааналізаваць дапамогу, аказаную Камітэтам ахвярам рэпрэсій.

Камітэт абароны рэпрэсаваных "Салідарнасьць" быў скліканы 5 красавіка 2006 года. Яго стварэнне – рэакцыя палітычных лідэраў і грамадскіх актывістаў на рэпрэсіі рэжыму ў адносінах да грамадзянаў, якія выказалі сваю пазіцыю падчас прэзідэнцкай кампаніі 2006 года.

**Галоўная задача** Камітэту абароны рэпрэсаваных "Салідарнасьць" – **разбурэнне страху ў беларускім грамадстве**.

На сённяшні момант вызначанымі накірункамі дзейнасці Камітэту з'яўляюцца наступныя:

- абарона правоў на свабодную адукацыю;
- абарона правоў на працу;
- садзейнічанне ў атрыманні медычнай дапамогі рэпрэсаваным грамадзянам і чальцам іхніх сем'яў, якія маюць патрэбу ў гэтым;
- матэрыяльная дапамога рэпрэсаваным грамадзянам і чальцам іх сем'яў;
- правядзенне інфармацыйных і грамадскіх кампаній салідарнасці як у краіне, так і за яе межамі;
- юрыдычная абарона актывістаў дэмакратычнага руху;
- падрыхтоўка і рассылка лістоў рэакцыі-ціску рэпрэсіўным органам;
- фармаванне "Чорнага спіса";
- аналітычныя справаздачы па фактах рэпрэсій і аказанай падтрымкі рэпрэсаваным.

Камітэт складаецца з дзвюх дзеючых групаў - **Рады Камітэта** і **працоўнага офісу**.

**Рада Камітэта** з'яўляецца стратэгічна-кантрольным органам, які зацвярджае накірункі дзейнасці Камітэта і вызначае бягучыя задачы. На паседжанні Рады Камітэта выносіцца рашэнне аб дапамозе і вызначаецца форма дапамогі. Рада

Камітэта прымае справаздачу працоўнага офіса за мінулы прамежак часу паміж паседжаннямі.
**Рада Камітэта** складаецца з лідэраў і чальцоў вядомых беларускіх арганізацый такіх як:

- “Праваабарончы альянс”;
- “Задзіночанне Беларускіх Студэнтаў”;
- “Асацыяцыя Беларускіх Медыкаў”;
- грамадская ініцыятыва “Салідарныя бацькі”;
- “Фонд развіцця прававых тэхналогій”;
- “Прававая дапамога насельніцтву”;
- “Беларускі Хельсінскі Камітэт”;
- “Камітэт абароны рэпрэсаваных “Салідарнасьць”;

а таксама з вядомых грамадскіх дзеячоў.

**Працоўны офіс** выконвае бягучую дзейнасць:

- фармуе пакет дакументаў на кожнага рэпрэсаванага;
- фармуе базу дадзеных;
- падтрымлівае пастаянныя кантакты з рэпрэсаванымі, якія звярнуліся па дапамогу ў Камітэт;
- непасрэдна аказвае неабходную дапамогу;
- рыхтуе статыстычныя і аналітычныя матэрыялы;
- падтрымлівае дыялог з Амбасадамі краінаў, акрэдытаванымі ў Рэспубліцы Беларусь і краінах-суседках з мэтаю вызначэння формаў падтрымкі рэпрэсаваных грамадзянаў нашай краіны з боку замежных дзяржаваў;
- падтрымлівае сувязь з донарамі (універсітэтамі, палітычнымі партыямі, грамадскімі аб’яднаннямі, рэлігійнымі канфесіямі, ініцыятыўнымі групамі і асобнымі грамадзянамі), якія аказваюць дапамогу рэпрэсаваным як у Беларусі, так і за мяжою;
- рыхтуе і ладзіць сустрэчы рэпрэсаваных, іх блізкіх і сваякоў з мэтаю маральнай падтрымкі і выпрацоўкі планаў сумесных дзеянняў;
- робіць маніторынг і фіксацыю фактаў рэпрэсій, рыхтуе і адсылае лісты рэакцыі-ціску рэпрэсіўным органам і фармуе так званы “Чорны спіс”;
- падрымлівае пастаянны інфармацыйны кантакт з беларускімі і замежнымі СМІ;
- ладзіць інфармацыйныя кампаніі «Салідарнасьць» як у самой краіне, так і за яе межамі (для дасягнення мэтаў выпускае штомесячную газету “Ня бойцеся!” і сайт www.salidarnasc.org).

За тры гады дзейнасці база дадзеных Камітэта абароны рэпрэсаваных “Салідарнасьць” налічвае 1536 чалавек, якія пацярпелі ад рэпрэсій беларускага рэжыму. Самая вялікая колькасць людзей, што звярнуліся па дапамогу на працягу аднаго года, склала 971 чалавек (2006 год). Гэта тлумачыцца тым, што падчас прэзідэнцкай кампаніі 2006 года, а таксама пасля яе заканчэння, з боку беларускіх уладаў быў распачаты беспрэцэдэнтны ціск на актывістаў дэмакратычнага руху. У 2007 годзе зафіксавана 343 звароты рэпрэсаваных грамадзянаў, у 2008 годзе па дапамогу ў Камітэт звярнуліся 222 чалавекі (Малюнак 1.)




*Малюнак 1. Колькасць зваротаў па дапамогу па гадах*

За тры гады дзейнасці Камітэта абароны рэпрэсаваных “Салідарнасьць” наладжана сістэма аператыўнай рэакцыі на факты рэпрэсій як у сталіцы рэспублікі горадзе Мінску, так і ва ўсіх рэгіёнах краіны. З 2008 года ва ўсіх сямі абласцях Беларусі працуюць рэгіянальныя каардынатары, якія падтрымліваюць кантакты з рэпрэсаванымі грамадзянамі і чальцамі іх сямей, дапамагаюць вызначыць прыярытэтныя патрэбы, збіраюць неабходную інфармацыю і дакументы для аказання юрыдычнай і медычнай дапамогі. Дзякуючы іх працы геаграфія дапамогі рэпрэсаваным значна пашырылася (Малюнак 2.).




*Малюнак 2. Адсоткавыя суадносіны зваротаў па рэгіёнах Беларусі.*

Вельмі цікавым падаецца аналіз узроставай катэгорыі рэпрэсаваных грамадзянаў. Найбольш актыўнай групай з'яўляюцца маладыя людзі ва ўзросце да 35 гадоў, пераважную большасць з якіх складаюць юнакі і дзяўчаты 19-25 гадоў (Малюнак 3). Студэнцкая і працоўная моладзь прымае самы актыўны ўдзел у акцыях пратэсту супраць абмежавання грамадзянскіх свабодаў, свабоды слова, свабоды веравызнання, у акцыях салідарнасці з палітзняволенымі і рэпрэсаванымі. Відавочна, што менавіта супраць моладзі ў першую чаргу скіравана рэпрэсіўная рэакцыя ўлады.




*Малюнак 3. Узроставая структура рэпрэсаваных*

Супраць іншадумцаў ужываюцца шматлікія формы рэпрэсій: крымінальныя справы, адміністратыўныя арышты, вобшукі, збіццё падчас мірных акцый, выключэнне з навучальных установаў, пазбаўленне працы, штрафы, выклік на размову ў КДБ, пераслед родных і блізкіх.

У залежнасці ад формы рэпрэсіі, а таксама згодна з узроставай катэгорыяй, фармуюцца патрэбы грамадзянаў, якія звяртаюцца па дапамогу ў Камітэт абароны рэпрэсаваных “Салідарнасьць”( Малюнак 4.)




*Малюнак 4. Суадносіны патрэбаў рэпрэсаваных*

Аналіз, праведзены Радай Камітэта падчас правядзення суразмоўя з рэпрэсаванымі маладымі людзьмі, паказаў, што прыярытэты ў абранні краіны для магчымага навучання палягалі не толькі ў іх інфармаванасці адносна краіны навучання і ў веданні мовы абранай краіны. У першую чаргу прыярытэт вызначаўся жаданнем навучацца недалёка ад роднай краіны, каб мець магчымасць прымаць актыўны ўдзел у акцыях негвалтоўнага супраціву дзеля дэмакратызацыі Беларусі (Малюнак 5.)

Як бачна з дыяграмы на малюнку 5, абсалютная большасць рэпрэсаванай моладзі жадае працягнуць адукацыю ў краіне-суседцы-Польшчы. Адукацыйная праграма Польскага Ураду для рэпрэсаванай беларускай моладзі пачала дзейнічаць з красавіка 2006 года і карыстаецца заслужаным попытам. Праграма імя Кастуся Каліноўскага дае шанец на атрыманне вышэйшай адукацыі еўрапейскага ўзроўню маладзёнам, якія пацярпелі ад рэпрэсій беларускага рэжыму, а таксама маладым людзям з рэпрэсаваных сем’яў. Абмежавання спецыяльнасцяў не існуе, уступныя экзамены не здаюцца. Малады чалавек мае магчымасць даказаць здольнасць навучацца ў межах праграмы і атрымаць дыплом. З 2007 года Праграма прапануе магчымасць навучання ў аспірантуры для маладых навукоўцаў, якія па ідэалагічных прычынах не могуць абараніць навуковыя працы ў Беларусі.
Другой прыярытэтнай краінай для атрымання адукацыі з’яўляецца Украіна. Вышэйшыя навучальныя ўстановы Украіны прывабныя для беларускай

рэпрэсаванай моладзі магчымасцю вучыцца завочна. Абмежавання спецыяльнасцяў няма. Праграма падтрымана Міністэрствам Паўночных Краінаў.

Вялікім попытам сярод моладзі карыстаецца і Еўрапейскі Гуманітарны Універсітэт, які працуе ў Вільні. Аднак працягнуць навучанне там могуць толькі студэнты гуманітарных спецыяльнасцяў, пазбаўленыя магчымасці навучацца на радзіме.

Праграмы Чэшскага і Эстонскага Урадаў даюць магчымасць атрымліваць адукацыю ў розных галінах, аднак колькасць удзельнікаў гэтых праграмаў абмежаваная.

Менш як 1% рэпрэсаваных маладых людзей хацелі б атрымаць адукацыю ў такіх краінах як Вялікабрытанія, Аўстрыя, Нарвегія, Бельгія, Нямеччына, Швецыя, Расія, Румынія, Францыя, Латвія, Нідэрланды. Камітэт абароны рэпрэсаваных “Салідарнасьць” намагаецца дапамагчы ў кожным такім выпадку індывідуальна.




*Малюнак 5. Зацікаўленасць рэпрэсаваных у краінах навучання*

Малюнак 6. дае ўяўленне аб структуры кандыдатаў на атрыманне альбо працяг адукацыі па міжнародных праграмах. Пераважную большасць складаюць студэнты, якія былі адлічаны з беларускіх ВНУ за актыўную грамадзянскую пазіцыю.




*Малюнак 6. Структура кандыдатаў на навучанне*

За тры гады працы Рада Камітэта абароны рэпрэсаваных мае распрацаваны механізм вызначэння адпаведнасці кандыдата на навучанне ўмовам адукацыйных праграмаў, сталыя партнёрскія стасункі з кіраўніцтвам праграмаў і донарамі. Камітэт "Салідарнасьць" адсочвае лёс кожнага студэнта і фармуе Базу спецыялістаў, якія пасля атрымання дыпломаў будуць запатрабаваныя ў Беларусі.

Табліца 1. прапануе дакладную колькасць студэнтаў, якія з дапамогай Камітэта абароны рэпрэсаваных маюць магчымасць атрымаць вышэйшую адукацыю за мяжой.

*Табліца 1.* **Дынаміка адукацыйных праграм**

| ***Краіна*** | ***2006-2007*** | ***2007-2008*** | ***2008-2009*** |
|---|---|---|---|
| Польшча | 244 | 71 | 62 |
| Украіна | 5 | 35 | - |
| Літва (ЕГУ) | 43 | 23 | 16 |
| Румынія | 4 | - | - |
| Эстонія | 10 | 5 | - |
| Латвія | 1 | - | - |
| Германія | 3 | - | - |
| Чэхія | 5 | 6 | 6 |
| Нідэрланды | - | - | 1 |
| Францыя | 1 | 1 | - |

Геаграфія размеркавання студэнтаў па гарадах і універсітэтах краінаў-суседак – Польшчы, Украіны, Літвы – вельмі шырокая, як і рознабаковая спецыялізацыя маладых беларусаў.

Камітэт “Салідарнасьць” прааналізаваў гэтыя дадзеныя. (Табліцы 2, 3, 4)

*Табліца 2.* **Структура праграмы імя К.Каліноўскага (падтрымана Польскім Урадам)**

| *Колькасць гарадоў* ***19*** | *Колькасць ВНУ* ***37*** | *Колькасць спецыяльнасцяў* ***77*** |
|---|---|---|
| У тым ліку: | У тым ліку: | У тым ліку: |
| Варшава, Вроцлаў, Познань, Гданьск, Гнезна, Лодзь, Беласток, Пултуск, Бяла-Падляска, Кракаў, Катовіце,Торунь, Ольштын, Слупск, Жэшуў, Люблін, Легніца, Аполе, Шчэцін. | Варшаўскі унівэрсітэт, Палітэхніка Варшаўска, Ягелоньскі універсітэт, Вышэйшая гандлёвая школа, Калегіум Еўрапейскі ім.ЯнаПаўла, Універсітэт Мікалая Каперніка, Акадэмія мастацтва, Універсітэт Марыі Кюры-Складоўскай, Універсітэт ім.Адама Міцкевіча, Вышэйшая тэатральная школа і г.д. | Паліталогія, эканоміка, турызм, еўрапейскія камунікацыі, механіка, акторскае мастацтва, гукарэжысура, рэстаўрацыя, права, журналістыка, гісторыя мастацтва, геаграфія, электроніка, археалогія, лінгвістыка, маркетынг, міжнародныя адносіны, псіхалогія, музыкалогія, хімія, фатаграфія, геалогія, графіка, тэалогія, архітэктура і г.д. |

*Табліца 3.* **Структура адукацыйнай праграмы Украіны (падтрымана Саветам Міністраў Паўночных Краінаў)**

| *Колькасць гарадоў* **4** | *Колькасць ВНУ-* **10** | *Колькасць спецыяльнасцяў* **– 20** |
|---|---|---|
| Кіеў, Луцк, Данецк, Львоў. | Універсітэт мастацкага мадэлявання і дызайна, Еўрапейскі універсітэт, Універсітэт экаміці і права, Нацыянальны універсітэт транспарта, Кіеўскі нацыянальны універсітэт тэатра, кіно і ТБ, Педагагічны універсітэт, Данецкі дзяржаўны універсітэт кіравання, Нацыянальны медычны універсітэт, Валынскі дзяржаўны універсітэт, Нацыянальная акадэмія кіравання. | Журналістыка, кампутарная графіка, мэнэджмент арганізацый, ІТ тэхналогіі, кіраванне праектамі, псіхалогія дашкольнага выхавання, тэлеаператар, рэжысура мастацкіх фільмаў, лекарская справа, фінансы, мэнэджмент міжнароднай эканамічнай дзейнасці. |

*Табліца 4.* **Структура адукацыйнай праграмы ЕГУ, Літва (падтрымана міжнароднымі донарамі).**

| *Колькасць студэнтаў* **16** | *Колькасць спецыяльнасцяў-* **8** |
|---|---|
| | Медыя і камунікацыі, сацыяльная і палітычная філасофія, паліталогія, культурная спадчына і турызм, гісторыя Беларусі і культурная антрапалогія, міжнароднае права, візуальны дызайн,еўрапейскія даследаванні. |

Кожны бакалаўр, магістр, кандыдат навук, які атрымаў дыплом у Еўропе, не толькі патрэбны будучай дэмакратычнай Беларусі як дасведчаны дыпламаваны спецыяліст. Ведаючы сістэму кіравання краіны ў якой ён атрымліваў дыплом, яе культурныя асаблівасці, маючы адпаведныя ўнутраныя кантакты, малады чалавек можа стаць запатрабаваным “дыпламатам” у справе хуткай інтэграцыі Беларусі ў Еўрапейскі Звяз.

З мэтай аказання эфектыўнай і markazнабаковай дапамогі рэпрэсаваным грамадзянам Камітэт прааналізаваў і такія красамоўныя дадзеныя як гендэрная структура рэпрэсаваных Табліца 6.

Колькасныя паказчыкі дапамогі ў атрыманні замежных візаў, прыналежнасць і ўзровень адукаванасці людзей, якія звярнуліся па дапамогу. На Малюнку 7. можна адзначыць, што сярод актыўных грамадзянаў, пацярпелых ад ціску рэжыму, больш як у два разы пераважаюць мужчыны.




*Малюнак 7. Гендэрная структура рэпрэсаваных*

З дыяграмы на Малюнку 8. відавочна, што актывісты дэмакратычнага руху – пераважна людзі з вышэйшай адукацыяй альбо студэнты навучальных установаў.




*Малюнак 8. Адукацыйны ўзровень рэпрэсаваных*

Аналіз дадзеных па адукацыйным узроўні і полавой прыналежнасці дае Камітэту магчымасць планаваць праграмы дапамогі рэпрэсаваным грамадзянам, пазбаўленым магчымасці працаўладкавацца. На жаль, мы вымушаны канстатаваць, што распачатыя ў 2006 годзе праграмы часовага працаўладкавання за межамі Беларусі амаль заблакаваныя пасля ўступлення краінаў-суседак у зону Шэнгена. Вялікая колькасць бюракратычных

працэдураў, сусветны фінансавы крызіс стрымлівае працадаўцаў ад заахвочвання працаўнікоў з-за мяжы.

*Табліца 5.* **Колькасныя паказчыкі дапамогі ў працаўладкаванні**

| 2006 год | 2007 год | 2008 год |
|---|---|---|
| 35 чалавек | 31 чалавек | 11чалавек |

На працягу ўсяго тэрміна дзейнасці Камітэта абароны рэпрэсаваных “Салідарнасьць” аказвалася дапамога актывістам дэмакратычнага руху ў атрыманні замежных візаў. Дзякуючы спрошчанай працэдуры атрымання дакументаў рэпрэсаваныя грамадзяне змаглі прымаць удзел у адукацыйных праграмах, падтрымліваць партнёрскія стасункі з грамадскімі арганізацыямі за мяжой, працаўладкавацца, сваякі студэнтаў, якія вучацца за мяжой, атрымалі магчымасць наведаць маладзёнаў.
Мы выказваем шчырую падзяку Амбасадам Польшчы, Літвы, Францыі і Чэхіі за дапамогу дэмакратычным актывістам у справе спрашчэння візавых працэдураў.

*Табліца 6.* **Колькасныя паказчыкі дапамогі ў атрыманні замежных візаў**

| 2006 год | 2007 год | 2008 год |
|---|---|---|
| 370 чалавек | 403 чалавекі | 117 чалавек |

З 2007 года Камітэт абароны рэпрэсаваных “Салідарнасьць” пачаў аказваць сталую прафесійную **юрыдычную дапамогу** рэпрэсаваным грамадзянам. Юрыдычная служба Камітэта “Салідарнасьць” паспяхова выконвала пастаўленыя задачы:

- папярэджанне рэпрэсій супраць грамадскіх актывістаў і іх сем’яў;
- маніторынг рэпрэсій;
- фармаванне базы дадзеных ахвяраў рэпрэсій і асобаў, закранутых палітычна матываваным пераследам;
- павелічэнне колькасці адвакатаў, якія працуюць з грамадскімі актывістамі.

У 2008 годзе былі ўсталяваны працоўныя кантакты з усімі праваабарончымі арганізацыямі Беларусі – ажыццяўляўся шэраг сумесных праектаў па маніторынгу правоў чалавека, юрыдычнай абароне і абароне грамадзянскіх інтарэсаў. Прадстаўнікі Юрыдычнай службы прымалі актыўны ўдзел у сумесных праваабарончых кампаніях па вызваленні палітычна зняволеных грамадзянаў, у аналітычных круглых сталах і сходах праваабаронцаў. Дзейнасць ажыцяўлялася ў межах галоўнай са стратэгічных задач службы – стварэння эфектыўнай сістэмы абароны грамадзянаў ад палітычна матываваных рэпрэсій.

У межах рэалізацыі задачы па падвышэнні ўзроўню самаабароны дэмакратычных актывістаў Служба падрыхтавала шэраг памятак-рэкамендацый юрыдычнага характару. Для шырокага ахопу мэтавай аўдыторыі памяткі-рэкамендацыі размяшчаліся на сайце Камітэта “Салідарнасьць” і на старонках штомесячнай газеты “Ня бойцеся!”

Юрыдычная Служба працягвае практыку падрыхтоўкі лістоў рэакцыі-ціску. Названыя лісты накіроўваюцца дзяржаўным чыноўнікам, працадаўцам, адміністрацыі навучальных установаў, служачым сілавых структураў і г.д. пры ажыццяўленні імі палітычна матываваных пераследаў грамадскіх актывістаў. Падрыхтаваныя юрыстамі Камітэта лісты падпісваюцца асабіста Аляксандрам Мілінкевічам.

Сутнасць зваротаў у папярэджванні, што некаторыя дзеянні дзяржаўных асобаў, звязаныя з ціскам на актывістаў (выключэнне з навучальных установаў, ілжэсведчанне, нематываваныя затрыманні, вынясенне неправасудных судовых рашэнняў), зафіксаваныя як факты палітычных рэпрэсій, выключную ўвагу ім надаюць нацыянальныя і міжнародныя сродкі масавай інфармацыі, праваабарончыя інстытуты. Лісты заклікаюць устрымацца ад незаконных дзеянняў рэпрэсіўнага характару і прытрымлівацца дзеючага заканадаўства.

Дадзеныя лісты выконваюць важную ролю як элемент маральнага ціску на дзяржаўных чыноўнікаў і падтрымкі грамадскіх актывістаў. Лісты таксама з’яўляюцца адным з метадаў збору інфармацыі аб фактах палітычных рэпрэсій і асобах, якія дазваляюць ці здзяйсняюць гэтыя рэпрэсіі ў Беларусі. Інфармуючы дзяржаўных чыноўнікаў аб тым, што ўсе іх дзеянні фіксуюцца, мы папярэджваем іх аб адказнасці.

Згодна з беларускім заканадаўствам аб звароце грамадзянаў, чыноўнікі абавязаны адказаць на ліст у вызначаны тэрмін, а таксама растлумачыць і абгрунтаваць законнасць сваіх дзеянняў.

У 2008 годзе ў Беларусі прайшлі парламентскія выбары. Падчас кампаніі Юрыдычная служба сумесна з рэгіянальнымі каардынатарамі правяла маніторынг рэпрэсій у адносінах да асобаў, якія прымалі актыўны ўдзел у электаральнай кампаніі.

У шэрагу выпадкаў Служба аказвала дапамогу пацярпелым ад пераследу ўладаў. Вынікі маніторынга штотыднёва накіроўваліся ў дыпламатычныя місіі, замежным партнёрам і міжнародным праваабарончым арганізацыям. Адмысловая ўвага падчас маніторынгу надавалась адсочванню сітуацыі з

палітычна матываванымі звальненнямі з працы і адлічэннямі з навучальных установаў.

Ад пачатку дзейнасці Камітэта абароны рэпрэсаваных "Салідарнасьць" актыўна дзейнічае праграма "Бацькоўская ініцыятыва". За тры гады яна ператварылася ў самастойны сталы прыклад развіцця грамадзянскай супольнасці.

Адной з асноўных задачаў, якія ставіць перад сабою Камітэт "Салідарнасьць", з'яўляецца арганізацыя кампаній салідарнасці з палітычна рэпрэсаванымі грамадзянамі. З мэтай шырокага распаўсюду інфармацыі аб фактах рэпрэсій супраць дэмакратычных актывістаў Камітэт ініцыяваў стварэнне сайта www.salidarnasc.org і выпуск штомесячнага выдання газеты "Ня бойцеся!". Адмыслова для кампаній па абароне канкрэтнай асобы дадаткова друкуецца спецвыпуск выдання.

З 2006 года Камітэт абароны рэпрэсаваных "Салідарнасьць" фармуе Базу дадзеных рэпрэсаваных грамадзянаў, якія сталі ахвярамі дзеючай улады. Звесткі, якія назапашваюцца ў Базе, дазваляюць нам не толькі планаваць эфектыўныя праграмы абароны і падтрымкі рэпрэсаваных актывістаў, але і прааналізаваць структуру дэмакратычнага асяроддзя. Так, аналіз прыналежнасці рэпрэсаваных грамадзянаў да палітычных і грамадскіх структураў дае нам магчымасць з упэўненасцю заявіць, што пераважная колькасць змагароў за дэмакратычную Беларусь не належыць да партый і грамадскіх арганізацый (Малюнак 9).




*Малюнак 9. Прыналежнасць рэпрэсаваных да партый і грамадскіх арганізацый.*

Дэмакратычнае асяроддзе дастаткова мабільнае і інфармаванае. Так, згодна з Базай дадзеных Камітэта "Салідарнасьць", грамадзянаў, якія актыўна карыстаюцца Інтэрнэтам (63%), амаль у два разы болей за людзей, якія не маюць сталага доступу да Сусветнай сеткі (37%).

За тэрмін дзейнасці Камітэта абароны рэпрэсаваных "Салідарнасьць Рада Камітэта адмовіла ў падтрымцы 2,6 % грамадзянаў, на падставе адсутнасці пацверджання факта рэпрэсій.

Дадаткі:




Мапа 1. Размеркаванне зваротаў і патрэбаў рэпрэсаваных тэрыторыі Беларусі




Мапа 2. Краіны-суседкі, у якіх навучаюцца рэпрэсаваныя

Мапа 3. Еўрапейскія краіны, з якімі наладжаныя партнёрскія адносіны



**Умоўныя знакі:**

Партнёрскія сувязі Камітэта абароны рэпрэсаваных "Салідарнасць"

- Наладжанае супрацоўніцтва
- Пажаданае супрацоўніцтва
- Краіны, якія прапанавалі месцы рэпрэсаваным студэнтам з Беларусі